**УДК 39(476-22)(091)+316.343:63-051(476)(091)** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-84-87**

# ЖЫЦЦЁВЫЯ СТРАТЭГІІ ВЯСКОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД[1]

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9940-0236***

*Разглядаюцца стратэгіі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў складаны перыяд пасляваеннага аднаўлення. У якасці крыніц выступілі як архіўныя дакументы, так і матэрыялы вуснай гісторыі. Фіксацыя на паўсядзённым жыцці дазволіла вызначыць асноўныя жыццёвыя стратэгіі – на аснове пастаўленай мэты (стратэгіі выжывання і адаптацыі) і па форме яе рэалізацыі. Выбар стратэгіі вызначалі сацыяльныя і жыццёвыя рэсурсы, магчымасць іх выкарыстання.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваенная вёска, вусная гісторыя, Паўночная Беларусь, жыццёвыя стратэгіі, стратэгія выжывання, стратэгія адаптацыі.*

**Уводзіны.** Аналіз архіўных дакументаў і наяўных палявых матэрыялаў дазваляе ў межах пасляваеннай Паўночнай Беларусі даследаваць стартавыя ўмовы пасляваеннага аднаўлення, узровень дабрабыту вясковага насельніцтва ў канкрэтным раёне. Фіксацыя ўвагі на паўсядзённым жыцці дазваляе ўбачыць асноўныя стратэгіі, якія выбіралі вяскоўцы пад уплывам пэўнай сітуацыйнай абумоўленасці. Можна вылучыць наступныя акалічнасці, што вызначалі спектр магчымых сацыяльных дзеянняў вяскоўцаў пры неспрыяльнай жыццёвай сітуацыі па аднаўленні ці паляпшэнні ўласнага сацыяльна-эканамічнага стану ў пасляваенны час:

– размяшчэнне населенных пунктаў у “зоне бедства” (вёскі, знішчаныя ў выніку карных экспедыцый і ваенных дзеянняў) ці “зоне адноснай стабільнасці” (ступень разбурэння нязначная ці ўвогуле адсутнічала);
– калектывізаваны раён ці адзінаасобны сектар;
– спецыфіка ландшафта і магчымасць выкарыстання прыродных рэсурсаў;
– месцараспалажэнне населенных пунктаў (паблізу ці ўдалечыні ад горада/ваеннага гарадка/буйнога мястэчка/чыгуначных станцый).

Спецыфіка абранага рэгіёна ў тым, што ён прадстаўляе дзве мадэлі сістэмы жыццезабеспячэння ў пасляваенны аднаўленчы перыяд, якія могуць быць транспарэнтнымі для ўсёй Беларусі. Справа ў тым, што Паўночная Беларусь уключала раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу (раёны з перавагай аднаасобных гаспадарак і цалкам калектывізаваныя раёны). У Полацкую вобласць, утвораную ў 1944 годзе, акрамя раёнаў з калгасна-саўгаснай сістэмай, уваходзілі так званыя “заходнія раёны”, якія з 1921 па 1939 год адносіліся да Польскай рэспублікі (Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Міёрскі, Плiскі і Шаркаўшчынскі), дзе ў першыя пасляваенныя гады пераважалі аднаасобныя гаспадаркі. Дадзеную акалічнасць неаднаразова падкрэслівала кіраўніцтва Полацкай вобласці: “Сельское хозяйство Полоцкой области имеет некоторую специфичность – она объединяет районы неоднородного социально-экономического уклада: имеются районы полностью коллективизаванные и районы, где преобладает единоличное хозяйство. Это усложняет руководство” [1, л. 74.]

Мэта: на падставе аналізу матэрыялаў вуснай гісторыі і архіўных дакументаў вызначыць і прааналізаваць жыццёвыя стратэгіі, якія выбірала вясковае насельніцтва пад уплывам пэўнай сітуацыйнай абумоўленасці.

**Асноўная частка.** Паняцце “жыццёвая стратэгія” не мае адназначнага тлумачэння. Аднак асноўнымі элементамі “жыццёвай стратэгіі” з’яўляюцца вызначэнне жыццёвай мэты і спосаб яе рэалізацыі. Аналіз архіўных дакументаў і наяўных палявых матэрыялаў, якія датычаць вясковай паўсядзённасці Паўночнай Беларусі ў пасляваенны час, дазваляе зрабіць выснову, што жыццёвыя стратэгіі паваеннага часу былі двух асноўных тыпаў:

***1. Стратэгіі на падставе пастаўленай мэты:*** стратэгія выжывання і стратэгія адаптацыі.

*Стратэгія выжывання* характэрна для сацыяльна-дэмаграфічных груп з невялікім жыццёвым і сацыяльным рэсурсам, невысокім статусам і пагаршаючымся матэрыяльным становішчам. Пад стратэгіяй выжывання разумеецца сукупнасць спосабаў і форм адаптацыі ва ўмовах неспрыяльнай жыццёвай сітуацыі з мэтай забяспечыць базавыя ўмовы жыццезабеспячэння (элементарнае фізіялагічнае выжыванне сялянскай сям’і). Дадзеная стратэгія рэалізоўвалася пераважна насельніцтвам, якое пражывала ў раёнах, аднесеных па выніках Вялікай Айчыннай вайны да найбольш пацярпелых, інакш кажучы, знаходзілася ў “зоне бедства”. Згодна з дакументамі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, такі статус мелі 36 раёнаў [2]. З іх 13 раёнаў адносіліся да тагачасных Віцебскай і Полацкай абласцей: Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехоўскі [2, л. 10]. Насельніцтва адзначаных раёнаў знаходзілася ў вельмі складаных умовах: “…на момант вызвалення пасяўныя плошчы складалі не больш 27% к 1940 году, коней засталося 13%, у асабістым карыстанні калгаснікаў хатняй жывелы

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД “Стратэгіі выжывання і адаптыўныя практыкі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд”, дамова № Г23ІП-037.

засталося 14% к даваеннай колькасці. Насельніцтва галадавала, мелася вялікая колькасць знясіленых…” [2, л. 29]. Неабходна адзначыць, што паваенныя калгасы мелі вельмі абмежаваныя рэсурсы для дапамогі насельніцтву. Пры значным скарачэнні матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, калгаснае кіраўніцтва перш за ўсё павінна было забяспечыць неабходны ўзровень вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі для дапамогі фронту і аднаўленчых працэсаў. Матэрыялы Занальнага дзяржаўнага архіва горада Полацка дазваляюць больш дэтальна вызначыць не толькі матэрыяльны ўзровень жыцця вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі, пераважна ўсходніх калектывізаваных раёнаў, але і зразумець выбар паваенных жыццёвых стратэгій. Інфармацыйна грунтоўнымі з’яўляюцца справаздачы мясцовых органаў улады пра пасляваенную рэчаіснасць. Так, расонскі райвыканкам паведамляў пра наступнае: “Из 16 сельсоветов Россонского района в 10 полностью сожжены и уничтожены все общие постройки и личные дома колхозников, сельскохозяйственный инвентарь, уничтожен скот. Из 38 000 населения до войны в районе осталось 17 508. Остальные уничтожены или угнаны. Посевы в 1944 году не производились. …население скрывалось в лесах от немцев 9 месяцев, т.е. до 12 июля 1944 г. После освобождения и возвращения – пепел. После освобождения всего района скота в личном пользовании – 600 голов. Мелкого скота и птицы не было. Всё население в исключительно тяжелых условиях. Стали восстанавливаться. Приобретать скот в западных районах за последнюю одежду и другие предметы, на 3-5 хозяйств коллективно покупали коров, птицу” [3, л. 13]. Нягледзячы на тое, што гаротны стан насельніцтва ў першыя паваенныя гады фіксуецца рэгіянальнымі матэрыяламі вуснай гісторыі па ўсёй тэрыторыі Паўночнай Беларусі, цяжкая паваенная сітуацыя Расоншчыны адклалася ў народнай памяці вяскоўцаў з іншых раёнаў адметна: “Самалёт ляціць – з боку фортачкі, а расонцы ідуць – з заду торбачкі” [4].

Сучасныя даследаванні і матэрыялы вуснай гісторыі дазваляюць дэталізаваць і пашыраюць тэрыторыю, якую можна аднесці да “зоны бедства”. Стратэгія выжывання была распаўсюджана сярод насельніцтва, якое вярталася на месца цалкам знішчанай вёскі і спрабавала вырашыць праблемы элементарнага жыццезабеспячэння. У якасці прыклада можна прывесці ўспамін жыхаркі Лепельскага раёна пра вяртанне дамоў, у спаленую вёску Стайск Слабадскога сельсавета: “*Так спалілі… былі калодцы, былі бярозы…нічаго – усё роўна зямлі. Нічаго не асталась! Толькі попел. Печы стаялі адны…Усё згарэла. Як было 30 з лішнім двароў – усе спалілі. Прыйшлі – во што надета. Дождь пройдзець. Сніміш, выкруціш і апяць надел. А як жыць? Тады пайшлі па родственнікам, хто куды…*” [5]. Людзі капалі зямлянкі, жылі ў непрыстасаваных для пражывання памяшканнях, а таксама па некалькі сямей у адной хаце. Якасць часовай забудовы і працягласць яе выкарыстання залежала ад магчымасцей той ці іншай вясковай сям’і: “*А пасля вайны мы сталі землянку капаць. У зямлянцы жылі, наверна, гады тры ці болей, а тады сталі строіцца – мама, мужчыны ж не было – дзве бабы… Бацька пайшоў да вайны ў армію і тым годам далжон быў прыйсці, а тут вайна началася. Ен і пагіб у вайну.*” [6]. Надзённай праблемай у першы год пасля вызвалення з’яўлялася адсутнасць базавых прадуктаў харчавання: “*Есць жа нечага было. …агарода не пахалі. …нічога не было* ***мы дабывалі яду****. Сабіралі, вясной рана, шніць у кустах, тады крапіўка падрасла – тады крапіву сабіралі, тады шчавель сабіралі. Гэта ўсё варылася і хлебалі, ні хлеба ні было, ні мукі, ні крупы – адна трава…*” [7]; “*Прыйшлі – нідзе нічога. Усё ж памешана, паблочана. Ні зерна, нічога. Травы, тады з бабушкай хадзілі – картошка дзе якая засталася на полі… Усю траву. Ела і я шнітку – няўкусна, але ж есць дужа хацелася…*”…” [8].

У складанай жыццёвай сітуацыі знаходзіліся сем’і, якія засталіся без бацькі і мелі абмежаваны рэсурс для аднаўлення. Ва ўспамінах рэспандэнтаў пра пасляваенную рэчаіснасць наяўнасць мужчыны ў сям’і асацыіравалася з перспектывай хуткага аднаўлення “*…так самі яны строілі, так у іх мужыкі былі – бацькі былі, так …а наш бацька не вярнуўся і мы жылі очэнь бедна*” [9]. Безумоўна, сацыяльная дапамога сем’ям, якія засталіся без бацькі ці апынуліся ў вельмі неспрыяльных жыццёвых абставінах, з боку дзяржавы прадугледжвалася, але трэба ўлічваць складанасці паваенных гадоў, час на падрыхтоўку дакументаў, падцвярджаючых факты таго, што бацька быў у партызанах, ці адносіўся да ліку ваеннаслужачых і загінуў і г.д. І тут трэба асобна ўзгадаць такую катэгорыю сямей, дзе бацькі былі абвінавачаны ў калабарацыянізме. Гэтыя сем’і атрымлівалі дапамогу ў апошнюю чаргу ці не атрымлівалі ўвогуле. Неабходна адзначыць, што інфармацыі па гэтым пытанні вельмі мала, ёсць невялікая колькасць архіўных дакументаў (пратаколы, дзе разбіраліся пытанні дапамогі, і рашэнні мясцовых органаў улады) і адзінкавыя ўспаміны рэспандэнтаў. Тым не менш, наяўныя крыніцы даюць магчымасць вылучыць такія сем’і ў асобную катэгорыю і зрабіць выснову пра тое, што яны былі абмежаваны ў выкарыстанні ўсіх наяўных рэсурсаў таго часу і вымушаны былі змагацца за выжыванне самастойна.

Выбар стратэгіі вызначалі сацыяльныя і жыццёвыя рэсурсы (мабілізацыя асабістых рэсурсаў і рэсурсаў прыроднага ландшафту), магчымасць іх аптымальна выкарыстоўваць. У паваенныя гады насельніцтва, якое пражывала ў населеных пунктах, дзе ступень разбурэння была нязначная ці ўвогуле адсутнічала, з аднаго боку мела лепшыя стартавыя ўмовы для аднаўлення, але з другога – пасляваенная рэчаіснасць была стрэсагеннай для насельніцтва, адрознівалася ад звычайных умоў жыццядзейнасці і вымушала выпрацоўваць адмысловую адаптацыйную мадэль узаемадзеяння са структурнымі элементамі стрэсагеннай сітуацыі.

*Стратэгія адаптацыі* – гэта адмысловая рэакцыя на стрэсагенную сітуацыю, якая прадугледжвала выбар адаптыўных практык, магчымасць пераразмяркоўваць жыццёвыя і сацыяльныя рэсурсы з мэтай дасягнуць аптымальнага ўзроўню жыццезабеспячэння. Стратэгія адаптацыі практыкавалася пераважна ў раёнах з аднаасобнымі гаспадаркамі (Браслаўскі, Відскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Мёрскі, Плiскі і Шаркаўшчынскі) і калектывізаванымі раёнамі, якія знаходзіліся ў зоне адноснай стабільнасці. З большага стратэгія адаптацыі

насіла кампрамісны характар. Як паказвае аналіз архіўных дакументаў і матэрыялаў вуснай гісторыі, ва ўмовах неспрыяльных жыццёвых абставін пераважалі рацыяльныя паводзіны, а прадстаўленні пра сацыяльную справядлівасць пэўным чынам трансфарміраваліся. Калі была магчымасць і ва ўмовах, калі "як-бы не заўважалі" і законы не парушаліся адкрыта, адбывалася ўхіленне ад выкананная пэўных абавязкаў на карысць тых, якія прыносілі рэальны прыбытак (асабліва гэта было характэрна для сялян-калгаснікаў, якія не выпрацоўвалі min працадзён, за якія амаль нічога не плацілі), самавольна пераразмяркоўваўся зямельны фонд, распрацоўваліся "маршруты" абыходу афіцыйных норм і правіл, павялічвалася доля "незаконных" паступленняў і г.д. У выніку законнымі ці незаконнымі метадамі, але адбываецца павольнае нарошчванне дабрабыту. Гэта было характэрна як для сялян-аднаасобнікаў з заходніх раёнаў рэгіёна, так і для сялян-калгаснікаў, уключаных у калгасна-саўгасную сістэму ў міжваены перыяд. Сітуацыя для першых ускладнілася, калі ў канцы 1940-х гадоў быў узяты курс на паскораную калектывізацыю і колькасць аднаасобных гаспадарак стала рэзка скарачацца. Да сакавіка 1950 года Браслаўскі і Докшыцкі раёны амаль завяршылі калектывізацыю. У 1955 г. у Віцебскай вобласці (Полацкая вобласць была скасавана ў 1954 годзе) ужо не было аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

Неабходна адзначыць, што іншы раз складана вызначыць выразную мяжу паміж стратэгіяй выжывання і стратэгіяй адаптацыі. Вялікае значэнне мелі такія фактары, як ступень разбуранасці мясцовасці, тэмпы аднаўлення, наяўнасць працаздольных членаў сям'і і магчымасць апрацоўваць зямлю, месца ў сацыяльнай структуры грамадства, сацыяльны клімат у вясковай грамадзе. Акрамя гэтага, у цяперашні час фактычна агульнапрынятым з'яўляецца ўяўленне аб тым, што "паводзіны вызначае не сітуацыя, якая можа быць апісана "аб'ектыўна" або па ўзгодненым меркаванні некалькіх назіральнікаў, а сітуацыя, як яна падаецца суб'екту, як яна існуе для яго"[10].

***2. Стратэгіі па форме рэалізацыі мэты*** (у залежнасці ад мэтанакіраванасці) былі прадстаўлены наступнымі:

– *вяртанне да натуральнай гаспадаркі*, якая дазваляла дасягнуць пэўнай ступені гаспадарчай аўтаномнасці і ў залежнасці ад запатрабаванняў сям'і праз абмен рэсурсамі забяспечыць сябе неабходнымі прадуктамі харчавання, сыравінай, адзеннем і прадметамі паўсядзённага жыцця. Гэта было характэрна як для сялян-аднаасобнікаў, так і для сялян-калгаснікаў, прысядзібная гаспадарка якіх у другой палове 1940-х гадоў іншы раз валодала вызначальна большым эканамічным патэнцыялам, чым праца ў калгасе. Факт павелічэння ролі прысядзібнай гаспадаркі сялян-калгаснікаў у ваенны і пасляванны час выклікаў прапановы сярод гісторыкаў перагледзець эканамічнае значэнне асабістай прысядзібнай гаспадаркі і яе дапаможны статус адносна калгаснай вытворчасці [11, с. 45]. Натуральныя даходы ад сваёй асабістай гаспадаркі сяляне атрымлівалі ў асноўным у выглядзе прадуктаў раслінаводства і жывёлагадоўлі, а таксама ад палявання, рыбалоўства, збіральніцтва і некаторых саматужных промыслаў;

– *жабрацтва* – прашэнне міласціны давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай смерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі. Жабраваць хадзілі ў раёны, якія найбольш ацалелі пасля вайны, а таксама па раёнах, дзе пераважаў адзінаасобны сектар. Праз уласны досвед ці абмен вопытам выпрацоўваўся пэўны алгарытм, які забяспечваў эфектыўнасць жабрацкай практыкі, бо мадэлі паводзін выбіраліся з улікам асаблівасцей успрымання тых, да каго жабракі звярталіся [12];

– *адыходніцтва*, якое ў сувязі са зменамі ладу жыцця ў перыяд пасляваеннага аднаўлення мэтазгодна вылучыць у асобны від стратэгіі, так як яно стала вельмі адрознівацца ад традыцыйнага промысла XIX – пачатку XX стагоддзяў, бо змянілася паўсядзённая спецыфіка і выкарыстоўваліся іншыя практыкі, асабліва ва ўмовах калгаснага ладу. Адыходніцтва ў пасляваенныя гады практыкавалася пераважна працаздольным насельніцтвам, дазваляла атрымаць рэсурсы для аднаўлення гаспадаркі і дасягнення пэўнага ўзроўню дабрабыту з аднаго боку; але з другога мела патэнцыяльна небяспечныя наступствы, у першую чаргу, для сялян-калгаснікаў і магла прывесці да змены сацыяльнага статуса;

– *нетыповыя формы эканамічнай і гандлёвай актыўнасці сялян* дазвалялі атрымаць грошы, неабходныя для набыцця тых прадуктаў і прамысловых тавараў, што нельга было вырабіць у межах сваёй гаспадаркі, а таксама для ўплаты падаткаў і пакупкі аблігацый дзяржаўных займаў (па падліках расійскіх даследчыкаў, у 1944 годзе ўплата падаткаў і набыццё аблігацый складалі больш чвэрці ўсіх грашовых выдаткаў сялянскай сям'і [11, с. 85]);

– *выкарыстанне дзіцячай працы* (ступень выкарыстання і практыкі адрозніваліся і залежалі ад узроўню жыцця канкрэтнай сям'і).

Вызначэнне дадзеных відаў стратэгіі мае істотную геаграфічную дэтэрмінаванасць. Трэба адзначыць, што адна сям'я магла выкарыстоўваць адначасова розныя стратэгіі: вяртанне да натуральнай гаспадаркі, практыкаваць жабрацтва ці адыходніцтва, пашыранае выкарыстанне дзіцячай працы і г.д.

**Заключэнне.** Фіксацыя на паўсядзённым жыцці дазволіла вызначыць асноўныя жыццёвыя стратэгіі – на аснове пастаўленай мэты (стратэгіі выжывання і адаптацыі) і па форме яе рэалізацыі. Выбар стратэгіі вызначалі сацыяльныя і жыццёвыя рэсурсы, магчымасць іх выкарыстоўваць. Уплыў мелі такія фактары, як ступень разбурэння мясцовасці і лакацыя населенага пункта, наяўнасць працаздольных членаў сям'і, месца ў грамадскай іерархіі, сацыяльны клімат у сельскім соцыуме. Адна сям'я магла рэалізоўваць адначасова розныя стратэгіі. Як паказвае аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі, ва ўмовах неспрыяльных жыццёвых абставін пераважалі рацыянальныя паводзіны, а прадстаўленне пра сацыяльную справядлівасць пэўным чынам трансфармавалася.

ЛІТАРАТУРА

1. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далее – ЗГА г. Полоцка). – Ф. 1974. Воп. 1. Спр. 118.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267 – О положении в наиболее пострадавших от немецкой оккупации районов Белоруссии.
3. ЗГА г. Полоцка. – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 9.
4. Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай: (Запісана аўтарам (ЗА) ў 2021 г.), Ж., 1937 г.н., в. Качаны Верхнядзвінскі р-н.
5. Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай: (ЗА ў 2022 г.), Ж., 1936 г.н, в. Багданава Сенненскі р-н.
7. Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай: (ЗА ў 2023 г.), Ж., 1938 г.н, в. Малая Пушча Полацкі р-н.
8. Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай: (ЗА ў 2021 г.), Ж., 1936 г.н, в. Басяныя Міёрскі р-н.
9. Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай: (ЗА ў 2023 г.), Ж., 1936 г.н, в. Бальшое Жэжліна Лепельскі р-н.
10. Водопьянова Н.Е., Старченкова Е.С. Трансактный подход к изучению стрессовых ситуаций в профессиональной деятельности [Электронный ресурс] // Вестник Санкт-Петербургского университета. Сер. 12. – 2008. – Вып. 2. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/transaktnyy-podhod-k-izucheniyu-stressovyh-situatsiy-v-professionalnoy-deyatelnosti. (дата обращения: 06.11.2023).
11. Мамяченков В.Н. Роковые годы: Материальное положение колхозных крестьян Урала в послевоенные годы (1946–1960). – Екатеринбург: Изд-во Гуманитарного университета, 2002. – 312 с.
12. Сумко А.В. Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки.– 2020. – № 9. – С. 142–147.

*Паступіў 09.12.2023*

## ЖИЗНЕННЫЕ СТРАТЕГИИ СЕЛЬСКОГО НАСЕЛЕНИЯ СЕВЕРНОЙ БЕЛАРУСИ В ПОСЛЕВОЕННЫЙ ПЕРИОД

***канд. ист. наук, доц. Е.В. СУМКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Рассмотрены стратегии сельского населения Северной Беларуси в сложный период послевоенного восстановления. В качестве основных источников – архивные документы и материалы устной истории. Фиксация на повседневной жизни позволила определить основные жизненные стратегии – исходя из поставленной цели (стратегии выживания и адаптации) и формы и способа ее реализации. Выбор стратегии определялся социальными и жизненными ресурсами, возможностью их использования.*

***Ключевые слова:*** *послевоенная деревня, устная история, Северная Беларусь, жизненные стратегии, стратегия выживания, стратегия адаптации.*

## LIFE STRATEGIES OF THE RURAL POPULATION OF NORTHERN BELARUS IN THE POST-WAR PERIOD

***E. SUMKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The strategies of the rural population of Northern Belarus during the difficult period of post-war reconstruction are considered. The sources included both archival documents and oral history materials. Fixation on everyday life made it possible to determine the main life strategies - based on the goal (strategy of survival and adaptation) and the form and method of its implementation. The choice of strategy was determined by social and life resources and the possibility of using them.*

***Keywords:*** *post-war village, oral history, Northern Belarus, life strategies, survival strategy, adaptation strategy.*